УДК 94(476)

## ДА ПЫТАННЯ АБ РЭАЛЬНАЙ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ XXXXVII НЯМЕЦКАГА ТАНКАВАГА КОРПУСА НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ЛЕТАМ 1941 ГОДА

***канд. гіст. навук, дац. С.Я. НОВІКАЎ***
**Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск**

*Асвятляюцца маштабы ўдзелу XXXXVII ТК у баявых дзеяннях пад Лепелем летам 1941 г. Вызначаюцца дакументальна пацверджаныя факты аб баях нямецкіх часцей на тэрыторыі Лепельшчыны. Выкарыстоўваецца максімальна поўнае кола дакументальных крыніц як савецкага, так і нямецкага паходжання.*

Неабходнасць пастаноўкі такога пытання вынікае з таго факта, што некаторыя цяперашнія ацэнкі, якія ў апошні час з'яўляюцца ў інфармацыйнай прасторы ў дачыненні да баявых падзей на Віцебшчыне ў ходзе Лепельскай аперацыі летам 1941 г., зноў гучаць без неабходнага навуковага абгрунтавання [1, с. 14]. Прычынай нашага звароту да рэальных баявых дзеянняў, што гістарычна мелі месца ў пачатку ліпеня на Лепельшчыне, з'яўляецца практычная прапанова мясцовых аматараў гісторыі і краязнаўцаў аб адкрыцці пад Лепелем мемарыяльнага знака танкістам, на якім будзе ўстаноўлена пліта з надпісам аб удзеле ў баявых дзеяннях на гэтым важным рубяжы абароны Заходняга фронту XXXXVII нямецкага танкавага корпуса (ТК). Нагадаем, што на самой справе гэты корпус складаўся з дзвюх танкавых і адной матарызаванай дывізій германскага вермахта. Аўтар гэтых радкоў не выказваецца супраць увекавечання памяці аб савецкіх танкістах 1941 г., наадварот, прыкладае намаганні па захаванні памяці аб усіх катэгорыях ахвяр летняй катастрофы Заходняга фронту ў Беларусі [2, с. 30].

У гэтым выпадку наша даследчыцкая задача заключаецца ў тым, каб на аснове дакументальных крыніц: 1) выявіць маштабы ўдзелу XXXXVII ТК у баявых дзеяннях пад Лепелем летам 1941 г.; 2) вызначыць дакументальна пацверджаныя факты аб баях нямецкіх часцей на тэрыторыі Лепельшчыны; 3) выкарыстаць для пацверджання гэтага максімальна поўнае кола дакументальных крыніц як савецкага, так і нямецкага паходжання.

Нагадаем чытачу, што навуковае вывучэнне Лепельскай аперацыі, больш вядомай сярод гісторыкаў і беларускіх чытачоў пад назвай "Лепельскі контрудар", фактычна не вялося да пачатку бягучага стагоддзя: па цяперашні час у айчыннай гістарыяграфіі адсутнічае спецыяльнае даследаванне на гэту важную тэму ваеннай гісторыі Беларусі летам 1941 г. [1, с. 23]. Калі не палічыць артыкул, падрыхтаваны ў 1971 г. для "Военно-исторического журнала" Міністэрства абароны СССР былым начальнікам штаба 5-га механізаванага корпуса і ўдзельнікам тых баёў В. Бутковым [3]. Праўда, гэты матэрыял, падрыхтаваны пераважна на аснове ўласных успамінаў, але з выкарыстаннем дакументаў з архіва Міністэрства абароны СССР, не стаў асновай для ўсебаковага аналізу для беларускіх даследчыкаў, паколькі быў прысвечаны разгляду баявых падзей толькі на фронце аднаго з двух карпусоў 20-й савецкай арміі.

У артыкуле В. Буткова даецца штодзённае апісанне ходу баявых дзеянняў 5-га савецкага корпуса на лепельскім напрамку на працягу амаль цэлага тыдня, з 6 па 11 ліпеня 1941 г. Пры гэтым аўтар адзначае, што ў двух механізаваных карпусах (5-м і 7-м) мелася больш за 700 танкаў старых тыпаў, у той жа час як лепельскую групоўку нямецкіх войскаў складалі 5 танкавых дывізій, што мелі больш за 1000 танкаў. Аўтар адзначаў, што агульныя страты 5-га механізаванага корпуса ў людзях і тэхніцы склалі каля 60%. (Нагадаем, што цалкам укамплектаваны асабовым складам і баявой тэхнікай савецкі механізаваны корпус складаў ад 31 да 36 тыс. чалавек) [1, с. 15].

Як вынікае з Дырэктывы № 16, аддадзенай камандаваннем Заходняга фронту на чале з Маршалам С. Цімэшэнкам 4 ліпеня 1941 г., вайсковым часцям фронту, у тым ліку двум механізаваным карпусам 20-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. Курачкіна, ставілася баявая задача аб ліквідацыі лепельскай групоўкі праціўніка, якая наступала ў напрамку Віцебска з раёна Лепеля, Полацка. Сілы 5-га механізаванага корпуса, куды ўваходзілі 13-я і 17-я танкавыя і 109-я мотастралковая дывізіі, наносілі ўдар з раёна Оршы ў напрамку на Сянно – Лепель з мэтай далейшага развіцця ўдару на захад, на Глыбокае і Докшыцы. Датай пераходу корпусу ў контрнаступленне было вызначана 5 ліпеня 1941 г. Паводле дакументаў аператыўнага аддзела штаба Заходняга фронту баявыя дзеянні, праведзеныя сіламі 5-га і 7-га механізаваных карпусоў 20-й арміі па выкананні Дырэктывы, атрымалі назву "Лепельскай аперацыі 6–11 ліпеня 1941 г." [4, арк. 111].

Дакументы нямецкага боку, у першую чаргу дзённік баявых дзеянняў 2-й танкавай групы, у склад якой уваходзіў XXXXVII ТК, утрымліваюць некаторыя фактычныя звесткі аб баявых падзеях на Віцебшчыне ў пачатку ліпеня 1941 г. Нагадаем, што на момант правядзення камандаваннем Заходняга фронту Лепельскай аперацыі з 6 па 11 ліпеня 1941 г. нямецкі танкавы корпус складаўся з дзвюх (17-й і

18-й) танкавых і адной (29) матарызаванай дывізій, якія з 3 ліпеня 1941 г. былі падпарадкаваны камандаванню 4-й танкавай арміі на чале з генерал-фельдмаршалам Г. фон Клюге [5, Bl. 114]. Неабходна адзначыць, што фактычна да завяршэння баявых падзей Лепельскай аперацыі асноўныя сілы 29-й нямецкай дывізіі забяспечвалі баявую ахову аднаго з рубяжоў у раёне Мінска, дзе да канца першай дэкады ліпеня ішло разбраенне амаль 300-тысячнай групоўкі савецкіх войск.

Так, у адпаведнасці з баявымі задачамі, пастаўленымі камандаваннем 4-й танкавай арміі перад XXXXVI і XXXXVII ТК на 6 ліпеня 1941 г., іх падраздзяленням для пераадолення Дняпра неабходна было перанесці галоўны ўдар у раён Шклова і Копысі. Пры гэтым XXXXVII ТК ставілася задача па дасягненні шашы на Смаленск і заняцці раёна на паўднёвы ўсход ад Духаўшчызны (50 км на паўночны ўсход ад Смаленска). Адцягваючы ўдар павінен наносіцца ўперад і на поўнач ад Оршы [6, Bl. 143].

Вечарам камандзір корпуса паведамляе камандаванню 4-й ТА аб наступным палажэнні, якое займаюць 17 і 18-я танкавыя дывізіі і 29-я матарызаваная дывізія XXXXVII корпуса. Першая з іх вядзе баі пад Сянно, куды яе перадавыя часці падышлі вечарам напярэдадні, дзе праціўнік упарта абараняецца, падцягваючы свежыя танкавыя сілы з Оршы і Коханава. З вячэрняга данясення вынікае, што групе ўдаецца адбіць моцны танкавы ўдар, нанесены пад Сянно савецкім бокам. Другая дывізія прасоўваецца павольна ўперад у сувязі з воднымі перашкодамі ў раёне Бабра і Талачына. У дачыненні аднаго з палкоў трэцяй дывізіі аддаецца загад аб яго выкарыстанні ў якасці аховы флангаў корпуса перад Оршай. З вячэрняга данясення вынікае, што корпус пакідае ў якасці галоўнай задачы на наступны дзень заняцце плацдарму для наступлення корпуса на поўнач ад Копысі 9 ліпеня 1941 г.

Дзень 7 ліпеня 1941 г. вызначаўся для часцей корпуса тым, што на фоне працягу заваёвы новых раёнаў для запланаванага наступлення камандаванне пачало перагрупоўку сіл. Пры гэтым у данясенні камандавання 2-й ТГр у штаб сухапутных сіл вермахта адзначалася, што ў 18-й танкавай дывізіі заставалася толькі 35% баявых машын, тады як у 17-й гэта лічба складала 60% [7, Bl. 149]. На нарадзе, якую ў сярэдзіне дня праводзіў камандуючы 2-й ТГр з мэтай абмеркавання наступлення цераз Днепр, камандзір XXXXVII адзначыў факт таго, што ў сувязі з вядзеннем праціўнікам упартай абароны ў раёне Сянно перад 17-я танкавай дывізіяй, а таксама па прычыне цяжкасцяў па пераадоленні забалочаных раёнаў паўздоўж шашы і поўнага разбурэння ўсіх мастоў на шашы корпус яна зможа пачаць наступленне толькі 10 ліпеня. З вячэрняга данясення ад камандзіра 17-й танкавай дывізіі вынікае, што падраздзяленні дывізіі вядуць цяжкія баі пад Сянно, дзе праціўнік вядзе наступленне як з поўначы, так і поўдня [7, Bl. 153].

Дзённае паведамленне за 7 ліпеня фіксуе наступнае аператыўнае палажэнне баявых сіл XXXXVII ТК: 18-я ТД знаходзіцца за 6 км ад Коханава; 17-я ТД вядзе ўпартыя баі пад Сянно; палова 29-я дывізіі ў рэшце рэшт зноў падпарадкоўваецца камандаванню корпуса пасля завяршэння баявой задачы па ўтрыманні ўсходняга рубяжа акружэння пад Мінскам. Камандаванне 2-й ТГр мае намер на 8.7.41 г.: заняцце новых раёнаў і перагрупоўка сіл для падрыхтоўкі наступлення цераз Днепр у раёне Старога Быхава, Шклова і Копысі.

Палажэнне часцей корпуса на раніцу 8 ліпеня 1941 г. выглядала такім чынам:

18-я ТД знаходзіцца з баявой групай пад камандаваннем Фрэмеры (адзін стралковы полк, адзін танкавы батальён, адзін артылерыйскі дывізіён і адзін батальён знішчальнікаў танкаў) у раёне на паўночны захад ад Коханава. Асноўныя сілы дывізіі знаходзяцца ў раёне Талачына – Крупак.

17-я ТД: адна баявая група пад камандаваннем падпалкоўніка Фрыца ў складзе матацыклетнага батальёна, аднаго танкавага батальёна і аднаго артылерыйскага дывізіёна знаходзіцца ў Талачыне; другая баявая група, якая складаецца з аднаго батальёна прыкрыцця, аднаго танкавага батальёна, аднаго артылерыйскага дывізіёна, аднаго батальёна знішчальнікаў танкаў і сапёрнага батальёна, знаходзіцца пад Сянно; група акружана праціўнікам і адрэзана ад дывізіі; трэцяя група, якая складаецца з рэштках дывізіі разам са штабам і адным танкавым батальёнам, знаходзіцца ў раёне Ліпавіч (за 17 км на паўночны ўсход ад Чарэі) – Чарэі.

План камандзіра дывізіі: групе ў раёне Сянно нанесці ўдар на поўдзень; групе Фрыцы – з Талачына на паўночны ўсход дзеля таго, каб абедзве групы сустрэліся ў Абольцы. Група ў раёне Чарэі павінна прасоўвацца на ўсход. Такі план не падтрымлівае камандаванне 2-й ТГр, паколькі ён скіраваны на драбленне дывізіі, што ў выніку можа прывесці да таго, што ні на адным з напрамкаў не ўдасца прарваць моцную абарону праціўніка [8, Bl. 161].

У сярэдзіне дня паступае загад камандуючага 4-й ТА паводле якога XXXXVII ТК павінен пачаць наступленне не раней за 11 ліпеня 1941 г. З вячэрняга данясення вынікае, што 18-я ТД наносіла ўдар на Талачын з паўднёвага ўсходу і поўначы, пры гэтым праціўнік стойка абараняецца. Камандаванне дывізіі плануе наносіць далейшы ўрад у напрамку на Коханава. Па даных штаба корпуса супраць дывізіі вядуць баі сілы трох савецкіх дывізій з удзелам падраздзяленняў з сярэднімі і цяжкімі танкамі. Баявая група на паўночны ўсход ад Чарэі разам з камандзірам дывізіі ў сярэдзіне дня апынулася ў акружэнні. У такім палажэнні быў аддадзены загад аб нанясенні ўдару танкавым батальёнам з раёна Сянно. Зенітны дывізіён

у баях пад Сянно на працягу дня знішчыў 19 танкаў. Апроч таго, па адыходзячым праціўніку былі нанесены ўдары нямецкай авіяцыі.

У вячэрнім данясенні камандавання XXXXVII ТК адзначаецца, што на працягу дня танкавыя часці вялі баі з моцным праціўнікам сіламі каля трох дывізій. Пры гэтым 18-я ТД працягвае наступленне супраць праціўніка, які ўпарта супраціўляецца. Дывізія выйшла на рубеж за 7 км на захад і 5 км на поўнач ад Коханава; 17-я ТД знаходзіцца ў раёне Сянно – Ліпавіч (17 км за паўднёвы захад ад Сянно). У ноч дывізія павінна нанесці ўрад на Коханава з мэтай злучэння там з 18-й ТД.

З дзённіка баявых дзеянняў 2-й ТГР за 9 ліпеня 1941 г. вынікае, што ў сярэдзіне дня танкавыя дывізіі атрымалі загад, адпаведна якому XXXXVII ТК павінен сабраць свае сілы пад Копыссю і потым пасля захопу плацдарму нанесці ўрад на паўночны ўсход ад Лядаў, такім чынам захапіць плацдарм Орша з усходу. Далейшае наступленне павінна праходзіць паабапал Дняпра ў напрамку на Смаленск і нанясення ўдару на Дарагабуж [9, Bl. 175]. Па стану на 18 гадзін камандаванне корпуса паведамляла аб наступным палажэнні танкавых дывізій: на паласе наступлення 18-й ТД націск праціўніка пачаў спадаць. Дывізія дасягнула ў сярэдзіне дня раён за 9 км на ўсход і паўночны ўсход ад Коханава і пачала рух на поўдзень з мэтай выхаду ў запланаваны раён. 17-я ТД асноўнымі сіламі знаходзіцца ў раёне Сянно, адкуль пасля абеду пачала рух на напрамку Абольцы і дасягнула Нямойту (9 км на поўдзень ад Сянно) каля 18 гадзін [9, Bl. 178]. Вечарам у гэтым раёне распачаліся баі з савецкімі танкістамі. Як вынікае з ранішняга данясення наступнага дня, завязаўся начны бой, у выніку якога пад Нямойтай дывізія і яе штаб панеслі вялікія страты. З савецкага боку ў ходзе баявых дзеянняў пад Нямойтай і Абольцамі было страчана 70 танкаў [10, Bl. 183].

Зварот да нямецкіх дакументаў, сярод якіх неабходна выдзеліць асобна данясенне аб баях 17-й ТД на шляху з Барысава цераз Сянно на Коханава [7, Bl. 1–6], дазваляе ўбачыць з процілеглага боку тыя баявыя падзеі. Нагадаем, што перад баямі пад Сянно дывізія з агульнай колькасцю 239 танкаў мела толькі 80 баявых машын, якія складалі рухомы агнявы кулак баявой групы пад камандаваннем палкоўніка Ліхта. З дакумента вынікае, што за часам 6-дзённага (з 5 па 10 ліпеня) баявога рэйду праз Сянно ў напрамку Коханава на полі бою дывізіяй былі знішчаны звыш 250 танкаў 5-га савецкага танкавага корпуса, з якіх з удзелам баявога атрада дывізіі толькі крыху больш за 100 машын, тады як большая частка – пры дапамозе нямецкай авіяцыі. Значаная колькасць страт была панесена ў раёне Толпіна, дзе дзейнічаў 39-ты танкавы полк 17-й танкавай дывізіі. У выніку баёў на працягу толькі аднаго дня 8 ліпеня ім былі знішчаны 68 савецкіх танкаў, з якіх 51 танк быў ліквідаваны ў выніку вядзення агню адным процітанкавым батальёнам.

Паводле данясення савецкае наступленне вялося ў двух напрамках – на Ліпавічы і Толпіна. Яно пачалося з атакі танкаў у 5.30 раніцы 8 ліпеня, але да 7-й гадзіны было спынена агнём процітанкавай артылерыі. У 8.10 быў нанесены новы моцны ўдар з выкарыстаннем танкаў і стралковых падраздзяленняў, якія наступалі пры актыўнай падтрымцы артылерыі. У выніку такога ўдару нямецкі бок апынуўся ў крызіснай сітуацыі і быў вымушаны пачаць адвод сваіх тылавых часцей і маршавых калон з раёна Толпіна ў напрамку Чарэі. Упартыя двухбаковыя баі ішлі на працягу ўсёй першай паловы дня. Баявыя дзеянні, якія вялі савецкія стралковыя і танкавыя часці ў раёне Ліпавіч і Толпіна, пачалі набываць завяршэнне толькі ў сярэдзіне дня. Паводле нямецкіх аператыўных дакументаў савецкаму боку ўдалося прарвацца на паўднёвы захад ад Толпіна, у выніку чаго ад баявых часцей дывізіі былі адсечаны адыходзячыя нямецкія тылавыя службы. Толпіна было захоплена 39-м нямецкім танкавым палком толькі ў 21.15. Між тым, у выніку баёў групы пад камандаваннем палкоўніка Ліхта ў раёне Ліпавічаў і Толпіна лічба страт савецкіх танкаў складала 34 баявых адзінкі. З вячэрняга данясення 39-га танкавага палка 17-й ТД вынікае, што толькі ў 21.15, пасля адчайных баёў, полк дасягнуў Толпіна. На працягу дня ім было знішчана 70 савецкіх праціўнікаў і значная колькасць аўтамашын з жывой сілай [11, Bl. 5].

На наступны дзень немцамі планавалася нанясенне ўдару на Сянно з мэтай злучэння баявых часцей, якія дзейнічалі ў раёне Абольцаў. Аднак выкананне гэтай задачы не адбылося па прычыне таго, што там былі выяўлены моцныя сілы праціўніка. Як адзначаецца ў дакуменце, толькі ў другой палове дня немцы нанеслі ўдар у напрамку на Сянно. Каля 17.00 баявая група дывізіі дасягнула Сянно на паўднёвым захадзе. Сітуацыю ў гэтым раёне выратавалі свежыя сілы 12-й нямецкай танкавай дывізіі, якую сюды ў якасці ўзмацнення накіравала камандаванне 4-й танкавай арміі. Толькі ў сярэдзіне дня 10 ліпеня 17-я нямецкая танкавая дывізія здолела дасягнуць Коханава.

Такім чынам, з нямецкіх дакументаў вынікае, што ў раёне Сянно дзейнічала баявая група пад камандаваннем палкоўніка Ліхта, якая складалася з 40-га ўзмоцненага стралковага батальёна, 27-га артылерыйскага дывізіёна, аднаго лёгкага артылерыйскага батальёна, адной лёгкай сапёрнай роты, дзвюх зенітных батарэй і адной роты тэхнічнага забеспячэння [11, Bl. 1]. Паводле штатнага раскладу гэтыя падраздзяленні складалі толькі частку паўнавартаснай танкавай дывізіі, але ні ў якім разе не ўсю баявую моц 17-й ТД, не кажучы аб іх параўнанні з сіламі XXXXVII танкавага корпуса, у складзе якога на той



PolotskSU

момант дзейнічала дзве танкавых і адна матарызаваная дывізіі 2-й нямецкай танкавай групы пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна.

Як вынік, якім бы не было стаўленне да нямецкіх дакументальных крыніц, аднак без іх выкарыстання практычна нельга ўбачыць тыя падзеі з іншага боку, без чаго сучаснае гістарычнае даследаванне аб вайне не можа быць поўным і аб’ектыўным. Але атрымліваецца, што ў апошні час агульным недахопам як навуковага, так і грамадскага дыскурсу становіцца тое, што, часам не маючы дастатковых дакументальных даных, некаторыя аматары гісторыі ці мясцовыя краязнаўцы імкнуцца паведаміць грамадскасці штосьці новае, што часцей за ўсе не мае пад сабой неабходнай дакументальнай часткі. Такі падыход можа прывесці да новых факталагічных памылак і з’яўлення домыслаў, а не верагодных навуковых ацэнак.

ЛІТАРАТУРА

1. Новікаў, С. Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі // С. Новікаў // Беларускі гістарычных часопіс. – 2012. – № 11. – С. 14–24.
2. Новікаў, С.Я. Абарона Брэсцкай крэпасці: гістарыяграфічных міфы і гістарычная рэальнасць / С.Я. Новікаў // Историческое наследие 1941 года в исследованиях и экспозициях музеев : материалы Междунар. науч.конф., посвященной 70-летию обороны Брестской крепости, Брест, 9–11 июня 2011 г. / редкол.: Г.Г. Бысюк [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2013. – С. 22–30.
3. Бутков, В.В. Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении / В.В. Бутков // Военно-исторический журнал. – 1971. – № 9. – С. 59–65.
4. Лепельская операция с 6 по 11 .07.41 г. // Цэнтральны архіў Міністэрства абароны РФ. – Ф. 208. Воп. 2511. Спр. 80.
5. Darstellung der Ereignisse am 3.7.1941 // Федэральны ваенны архіў Германіі (далей BA-MA). – RH 21-2/927. Bl. 114–121.
6. Darstellung der Ereignisse am 6.7.1941 // BA-MA. – RH 21-2/927. Bl. 140–148.
7. Darstellung der Ereignisse am 7.7.1941 // BA-MA. – RH 21-2/927. Bl. 149–158.
8. Darstellung der Ereignisse am 8.7.1941 // BA-MA. – RH 21-2/927. Bl. 159–168.
9. Darstellung der Ereignisse am 9.7.1941 // BA-MA. – RH 21-2/927. Bl. 171–178.
10. Darstellung der Ereignisse am 10.7.1941 // BA-MA. – RH 21-2/927. Bl. 181–189.
11. Bericht über Marsch und Kampf der 17. Pz. Division von Borissow über Senno nach Kochanowo: Anlage Nr. 248 zum Kriegstagebuch Nr. 2 des XXXXVII. Pz. Korps // BA-MA. – RH 24-47/5. Bl. 1–6.

## TO THE QUESTION ABOUT THE ACTUAL COMBAT ACTIVITIES OF XXXXVII ARMOURED CORPS IN THE SUMMER OF 1941 IN THE VITEBSK REGION

***S. NOVIKOV***

*The scale of XXXXVII armoured corps participation in operation under Lepel in the summer of 1941 is given. Documented facts about the fighting of German units on the territory of Lepel are defined. The most complete range of documentary sources both the Soviet and German origin are used.*

Polotsk SU